ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
25
ЛЮТАГА
№ 6(1564)

Газета выдаецца з 1922 года.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### Навукова-практычную

канферэнцыю «70 гадоў на варце заваёў Вялікага Кастрычніка» адкрыў сакратар парткома БДУ імя У. І. Леніна М. І. Юрчук. У ёй прыняў удзел намеснік камандуючага ЧБВА генерал-лейтэнант І. В. Вельджанаў, які выступіў з дакладам «70 гадоў на варце сацыялістычнай Радзімы».

У сваёй прамове Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў спыніўся на гісторыі развіцця Савецкіх Узброеных Сіл у перадваенныя гады, а студэнт юрфака А. Дземяшкевіч расказаў аб пераемніках слаўных баявых традыцый бацькоў і дзядоў — воінах-інтэрнацыяналістах.

Для ўдзельнікаў дэманстраваўся хранікальна-дакументальны фільм аб Вялікай Айчыннай вайне.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### Лепш менш

ды лепш. Так вырашылі старшыні груп народнага кантролю ў час разгляду пытання аб напрамках работы народных кантралёраў.

— Нам не варта драбніць,— прапанаваў прадстаўнік НДІ ядзерных праблем В. А. Андрэічаў.— Не выконваць ролю падсобных рабочых пры дэканаце, а цесна супрацоўнічаць з ім, выконваючы свае абавязкі.

З улікам гэтага 18 лютага на чарговай нарадзе ў камітэце народнага кантролю і была праведзена карэкціроўка планаў работы груп.

Д. ДОЎНАР.

### Бронзавым прызёрам

чэмпіянату СССР па класічнай барацьбе, які праходзіў у Тбілісі, у вагавой катэгорыі 90 кг стаў студэнт 3 курса геафака С. Дземяшкевіч.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### Дзе ўзяць

дапаможны матэрыял для лекцый, семінарскіх заняткаў? Звярніцеся ў Мінскую гарадскую кантору кінапракату. Магчыма, вас зацікавяць такія фільмы, як «Вялікі Кастрычнік у Беларусі», «Увага: метанол — яд!», «Тэхнічныя сродкі навучання ў вучэбным працэсе», «Камп'ютэр для ўсіх», «Разам з Макаранкам», «Навукова-тэхнічны прагрэс і бяспека працы» на трыццаціпяці- і шаснаццацімiліметровай плёнцы. Тут прапануюць вам і іншыя навукова-папулярныя і вучэбныя кінастужкі.

В. ШУШКЕВІЧ.

## МЖК ДЗЕЙНІЧАЕ



Вялікі дом (такі, каб хапіла месца ўсім супрацоўнікам універсітэта, якія яшчэ маюць патрэбу ва ўласнай кватэры) збудаваць сваімі рукамі вельмі цяжка. Асабліва калі ты не муляр, не цясляр, а ўсяго толькі асістэнт кафедры матэматычнай фізікі. Але Юрыя Пазняка, старшыню аргакамітэта МЖК, пераканаць у гэтым, здаецца, немагчыма.

Рэпартаж аб суботніку членаў МЖК змешчаны на 2-й старонцы газеты.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

## МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# Да сустрэчы, Сюзанна!

**Пасля такіх сустрэч я пакутую, спрабуючы знайсці адказ на чарговае пытанне. Як пасля цёплых поціскаў рук на Эльбе мог узнікнуць план знішчэння Савецкага Саюза. Народы дзвюх вялікіх дзяржаў, калі ж вы нарэшце зразумееце, што жыццё даецца нам толькі адзін раз і нельга марнаваць яго на ўзаемныя падазрэнні, штомінутны страх і нянавісць? Але ж я ведаю (не толькі здаецца, так на самай справе), для сарака маладых людзей, якія прысутнічалі на сустрэчы ў дыскусійным клубе «Палітыкус, час узаемаразумення і дружбы ўжо надышоў.**

Савецкія і амерыканскія. Вельмі розныя і вельмі падобныя адзін на аднаго. Побач са мной сядзіць Сюзанна, студэнтка Колбі каледжа штата Мэн. Будучая спецыяльнасць сённяшніх гасцей «Палітыкуса» — юрысты. Людзі гэтай прафесіі карыстаюцца ў Злучаных Штатах павагай асаблівай: далёка не кожная сям'я можа знайсці 17,5 тысячы долараў для таго, каб сын ці дачка атрымалі юрыдычную адукацыю.

Цікава, што, скончыўшы школу, малады чалавек можа падаваць дакументы адразу ў некалькі навучальных устаноў. Калі атрымае запрашэнне адразу з усіх — паявіцца магчымасць выбару ў залежнасці ад прэстыжнасці каледжа, кошту навучання і асабістых сімпатый. Выбар зроблены, і цяпер для таго, каб стаць студэнтам, застаецца напісаць сачыненне.

— Але можа здарыцца, што пасля аднаго, двух гадоў навучання стане зразумела, што грошай не хапае? — непакоюся я.

— О, гэта не такая ўжо вялікая непрыемнасць. Можна, напрыклад, пайсці служыць у армію. За чатыры гады на вучобу абавязкова заробіш,— уступае ў гаворку Брэд, калега Сюзанны.— Завербавацца ў армію сапраўды проста — у кожным каледжы працуе агент па вярбоўцы, дзейнічаюць яны даволі нахрапіста. І гэта не падабаецца амерыканскім студэнтам.

— Ці атрымліваюць вашы студэнты стыпендыю?

— Не, толькі тыя, хто жыве ў нястачы. І яшчэ, для гэтага абавязкова быць выдатнікам.

— Ці спадабаўся вам Мінск?

— Так. Людзі больш ветлівыя, добразычлівыя, чым у іншых гарадах, дзе мы былі,— адказвае Сюзанна.

— ... і ўсміхаюцца часцей,— дадае Брэд.

Праміную час сустрэчы. Развітвацца не хацелася. Але хто ведае, магчыма, хутка ў клубе Колбі каледжа на пытанні будуць адказваць савецкія студэнты. Да сустрэчы, Сюзанна! Да пабачэння, Брэд!

Ю. ЧАБАТАРОЎ,
студэнт ФПМ.

## РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

Ён абураўся:

— Нашто мне вашы класікі? Чытайце, перачытвайце, толькі не перашкаджайце мне. МНЕ не спатрэбіцца руская літаратура.

На яго думку, ён меў рацыю. Ніхто не мог пазбавіць яго права на законную тройку. І таму, не звяртаючы ўвагі на іншых, што праседжвалі да ночы ў бібліятэках, за два тыдні пачыналі рыхтавацца да залікаў і экзаменаў, вялі канспекты, ён са спакойным сумленнем працягваў выкладчыку залікоўку. Дзіўная справа, чатыры гады з прапановай згаджаліся: «выдатна» ж не патрабуе, згодзен на «здавальняюча». А тут...

— У вас поўная адсутнасць ведаў, малады чалавек,— збянтэжана вымавіла выкладчыца.— Вы нават назваў твораў, акрамя школьнай праграмы, пералічыць не можаце.

# Намалюйце «тройку» ў залікоўку

І тады прагучаў гнеўны маналог, з якога было зразумела адно: выцягнуць нават самыя пасрэдныя веды да тройкі выкладчык абавязаны.

Ён атрымаў перамогу, аб чым сведчыць запіс у залікоўцы.

...У дэканат яна не ўвайшла, убегла, грымнуўшы дзвярыма. Дробныя слязінкі злосна пабліскваді на твары:

— Сядзела, сядзела, паўтарала па тры разы, а ён...

Карацей кажучы, чацвёркай за перанесеныя пакуты яе пакрыўдзілі. Не ведала адказу на пытанне? Але ж старанна рыхтавалася, і потым, яна ж намякнула, што атрымлівае павышаную стыпендыю. Можна было б яе маўчанне на пытанне і не заўважыць.

Здаецца, не падобныя адзін на аднаго выпадкі са студэнцкага жыцця. Апынуліся ж побач на газетнай старонцы і дазволілі зрабіць вось такі несуцяшальны вывад: і троечніка, і выдатніка мала хвалюе якасць набытых ведаў, галоўнае — атрымаць адзнаку. Калі ісці далей, удакладняючы і абагульняючы, то многія студэнты наогул не разумеюць, навошта патрэбна сістэма залікаў і экзаменаў.

Тып узаемаадносін выкладчыкаў і студэнтаў можна назваць экстрэмісцкім. Асабліва наглядна прадстае гэта ў час сесіі, калі замест адзінства ў дасягненні мэты — вернай ацэнкі ведаў студэнтаў, назіраецца жорсткае процістаянне дзвюх сіл. Гэта яшчэ больш іх раз'ядноўвае.

Як здараецца часам? Прыходзіць на экзамен студэнт: адкрыты позірк, гальштук, касцюм, а другі пасля бяссоннай ночы нават зірнуць у люстэрка не паспеў. Тут ужо і самы аб'ектыўны чалавек можа памыліцца.

Памятаю, была ў нас у групе дзяўчына, якая і канспекты вяла акуратна (увесь курс потым пры падрыхтоўцы да экзаменаў імі карыстаўся), і лекцыі наведвала, і падручнікі ведала амаль што па параграфах, а ў час адказу гублялася. Хто лепш за ўсіх мог падказаць выкладчыку, што ёй патрэбна больш часу, каб сканцэнтравацца, сабрацца з думкамі? Зразумела, прадстаўнікі групы.

Магчыма таму і ўнесены ў пастанову «Аб першачарговых мерах па расшырэнню ўдзелу студэнтаў у кіраванні вышэйшымі навучальнымі ўстановамі» такі пункт: «Дазволіць прадстаўнікам выбарнага актыву студэнцкіх грамадскіх арганізацый, старастам груп прысутнічаць на заліках, экзаменах, абаронах курсавых і дыпломных работ і ўносіць прапановы па ўдасканаленню практыкі іх правядзення».

Слушная прапанова, але ў час зімовай сесіі ёю мала хто карыстаўся. Не ведалі? Не навучыліся? Пабойваліся?

На працягу трох мінулых гадоў паказчыкі паспяховасці студэнтаў універсітэта пастаянна зніжаліся. Упершыню пасля доўгага часу ў зімовую сесію абсалютная паспяховасць дасягнула 90,83 працэнта.

Побач з гэтай лічбай стаяць іншыя, бачыць якія не вельмі прыемна. 2706 студэнтаў (з 8535) маюць змешаныя адзнакі (гэта значыць, што не могуць або не ўмеюць карыстацца ўласным патэнцыялам), 340 вучацца толькі на тройкі (даўно звыкліся са становішчам пасрэднасці?), 680 двоечнікаў (чаму на іх бесклапотнае жыццё павінны трацілаца дзяржаўныя грошы?).

«Тэрмін ліквідацыі запазычанасцей — да першага сакавіка» — такія аб'явы пакуль не зніклі з факультэцкіх дошак аб'яў. Двоечнікаў увагай не абдзялілі. Імкнуцца знішчыць плямы непаспяховасці. А «ціхія троечнікі» — пасрэднасці ў вучобе і, такім чынам, у народнай гаспадарцы грамадскага спакою пакуль не парушаюць.

З. МАРАВА.

## МЖК ДЗЕЙНІЧАЕ





# Запрашаем на суботнік

ДЛЯ ТАГО, каб лепш зразумець дзень сённяшні МЖК у БДУ імя У. І. Леніна, думаю, неабходна зазірнуць у недалёкае мінулае.

У газеце ўжо неяк упаміналася, што шлях да арганізацыі МЖК быў не з лёгкіх.

У 1984 годзе восенню камсамол універсітэта рыхтаваўся да свайго форума — чарговай справаздачна-выбарнай канферэнцыі. Да гэтага часу вопыт арганізацыі і будаўніцтва МЖК у розных гарадах краіны дастаткова поўна быў распаўсюджаны праз сродкі масавай інфармацыі. Прыйшла хваля ажыўлення і ў наш горад. Частка моладзі, якая адчувала патрэбу ў жыллі, актыўна пачала «прабіваць» (інакш не назавеш) сцяну непаразумення неабходнасці стварэння МЖК.

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў было вырашана вынесці пытанне па МЖК на агульнауніверсітэцкую камсамольскую канферэнцыю, а потым на раённую справаздачна-выбарную канферэнцыю. Але добраму рашэнню не прыйшлося ўвасобіцца ў справу. Пра МЖК нібы забыліся, пытанню не прыдалі сур'ёзнай, належнай увагі.

Не адбылося выступлення і перад дэлегатамі раённай канферэнцыі. Яно паступіла ў прэзідыум у выглядзе запіскі. На вялікі жаль, прыйшлося выслухаць адказ кіраўніцтва горада аб немэтазгоднасці пакуль стварэння ў Мінску МЖК (не было сродкаў).

Год 1985. Урэшце выходзіць Пастанова ЦК КПСС аб неабходнасці развіцця будаўніцтва МЖК. І ўсё становіцца на свае месцы...

Можа і не патрэбна было ўспамінаць даўняе. Але з-за нядбайных, няўважлівых адносін да ініцыятывы моладзі рэальныя людзі не змаглі набыць рэальных кватэр у 1989 годзе, бо пры падвядзенні вынікаў улічваўся ўдзел арганізацыі ў стварэнні МЖК да пастановы гарвыканкома ад 3 верасня 1987 года. А ў нас няма ніякіх дакументальных пацвярджэнняў, дзе гэты ўдзел фіксаваўся б.

Сёння універсітэцкі калектыў кандыдатаў, якія ўдзельнічаюць у сацспаборніцтве «Лепшае прадпрыемства горада ў руху МЖК», ідзе ў ліку лідэраў. І ў гэтым першачарговая заслуга аргкамітэта. Хочацца сказаць словы падзякі У. Р. Івашыну, В. А. Прокашавай, А. І. Жуку за пастаянную ўвагу і падтрымку.

Зусім нядаўна ў савеце МЖК мы яшчэ толькі гаварылі аб арганізацыі сацспаборніцтва, аб правядзенні суботнікаў. А сёння — спаборніцтва кіпіць. Ёсць яшчэ і тыя, хто вагаецца: заявы прынеслі, а ўдзельнічаць у суботніках не знаходзяць часу.

Аргкамітэт у арганізацыі суботнікаў пайшоў па такому шляху. Усталяваў мінімальную колькасць гадзін — 40 у І квартале. Заключаны дагавор з заводам сілікатных вырабаў г. Мінска.

Удзельнікі сацспаборніцтва могуць адпрацоўваць указаную колькасць гадзін на заводзе як у будзённыя дні, так і ў выхадныя.

Рэгулярна, кожны панядзелак у 17.00, у аўдыторыі 306 галоўнага корпуса праводзяцца пасяджэнні аргкамітэта МЖК БДУ. На пасяджэннях вызначаюцца бягучыя пытанні адносна суботнікаў, палажэнні аб сацспаборніцтве, сацыяльна-культурныя праграмы.

Ю. ПАЗНЯК.







## НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

# Для будучых настаўнікаў

беларускай мовы і літаратуры магазін «Метадычная кніга» прапаноўвае наступныя метадычныя дапаможнікі, якія вы зможаце выкарыстаць як у час вучобы, так і ў будучай працы.

* Беларуская мова. Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі (пад рэдакцыяй А. Падлужнага). Мн., Нар. асвета, 1987.

* У. Вярбіла, Я. Лаўрэль, М. Яленскі. Багата, родная ты мова. Мн., Нар. асвета, 1987.

* А. Каўрус. Стылістыка беларускай мовы. Мн., Нар. асвета, 1987.

* С. Кячык, В. Рагаўцоў. Моўны разбор у ВНУ і ў школе. (Схемы, узоры, заданні). Мн., Выш. шк., 1987.

* Я. Лаўрэль, Ж. Прыймак, В. Раманцэвіч. Алімпіяды па беларускай мове.

* Адрас магазіна: вул. Берута, 22, корп. 2. Праезд тралейбусам № 9 да прыпынку «Кінатэатр «Сучаснік».

Т. РАДЗІКА,
таваразнаўца.

# Добры пачатак

ПРАЗВІНЕЎ званок. Закончыліся заняткі на першым і другім курсах філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Але студэнты не разыходзіліся. Яны сабраліся, каб разам з выкладчыкамі, прадстаўнікамі выдавецтва «Універсітэцкае» і супрацоўнікамі вучэбна-метадычнага кабінета МінВНУ БССР пагутарыць аб кнізе аднаго са старэйшых выкладчыкаў кафедры зарубежнай літаратуры Н. І. Лапідуса «Античная литература» (Выд. «Універсітэцкае», 1986 г.).

Данае выданне — першая частка серыі «История зарубежной литературы», задуманай з сямі кніг, адпаведна сямі семестрам, у якіх прадугледжана вывучэнне гэтай дысцыпліны ва універсітэце. Дапаможнік пабудаваны на аснове вучэбных планаў філалагічных факультэтаў і скарэкціраваны прымяняльна да нацыянальных ВНУ.

У невялікай па аб'ёму кнізе аўтар імкнуўся захаваць традыцыі лепшых падручнікаў па антычнай літаратуры і ўвесці навейшыя даныя, стварыць кампактнае выданне, у якім спалучалася б навуковасць з даступнасцю, што дасць магчымасць кожнаму студэнту атрымаць неабходныя гісторыка-літаратурныя звесткі пра тую ці іншую эпоху, навучыцца самастойна думаць.

Як жа ацэньваюць студэнты вучэбны дапаможнік?

У выступленнях першакурсніц С. Мультан, І. Ржэцкай, І. Сачык, Р. Чашун, В. Малаток і іншых прагучалі словы ўдзячнасці аўтару і выдаўцам за гэту вельмі патрэбную кнігу. Яны адзначылі, што студэнтам, якія прыйшлі ў ВНУ адразу пасля школы, складана знаёміцца з антычнай літаратурай, з якой яны раней не сутыкаліся. Дапаможнік напісаны сцісла, даходліва і займальна, па ім лёгка рыхтавацца да практычных заняткаў. Вялікая колькасць ілюстрацый, якія адсутнічаюць у іншых, аб'ёмных падручніках, дапамагае ўспрымаць тэкст. Паралельна з разборам твораў даецца характарыстыка перыяду. Гэта вельмі зручна: засяроджваецца ўвага на кожным факце, паяўляецца жаданне вывучаць матэрыял глыбей.

М. Трус і С. Шупенька падкрэслілі каштоўнасць выдання для студэнтаў беларускага аддзялення філфака. Асаблівая ўвага ўдзяляецца перакладам твораў зарубежных аўтараў на беларускую мову, фактам успрымання сусветнай класікі нацыянальнай культурай Беларусі.

Студэнты звярнуліся з просьбай да аўтара і выдавецтва пры перавыданні дапаможніка больш падрабязна спыніцца на рымскай літаратуры, у канцы кожнага перыяду даваць спіс дадатковай літаратуры, а таксама выказалі пажаданне выдаваць такую літаратуру ў цвёрдым пераплёце.

Загадчыца рэдакцыі філалагічнай літаратуры выдавецтва «Універсітэцкае» І. В. Смяян расказала аб кнігах, якія ўжо выйшлі і якія плануюцца да выдання ў серыях «Белорусский фольклор в современных записях», «Славянские языки», «Университет — школе», «Современный русский язык», «Сучасная беларуская мова», адказала на пытанні прысутных.

Мяркуючы па пісьмах, якія прыходзяць у рэдакцыю з розных куткоў краіны з просьбай дапамагчы набыць кнігу, можна сцвярджаць, што пакладзены добры пачатак у выданні запланаванай серыі «История зарубежной литературы».

А. ЗЯНЬКЕВІЧ,
рэдактар па рэкламе выдавецтва «Універсітэцкае».

## ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО АДПАЧЫНКУ

# Гуляйце з ўдачай

Год назад нарадзіўся «Спортпрагноз». Латарэю чакалі з нецярплівасцю. За гадзіну апусташалі кіёскі, дзе яна прадавалася. Потым зацікаўленасць знікла. Не ў кожнага атрымліваецца прагназіраваць беспамылкова, разбірацца ў стракатай сумесі каманд і відаў спорту, якую штотыднёва прапаноўваюць арганізатары латарэі.

Нарэшце з'явілася магчымасць і на прагноз гульняў адной, любімай каманды. Прайшоў спецыяльны тыраж на гульні Чэмпіяната свету па шахматах, ідзе — на футбольныя гульні. Не зявай, армія балельшчыкаў! У шасці варыянтах прагнозу ў адным білеце знаўцам футбола прамахнуцца амаль немагчыма. Спяшайцеся, удзел у тыражы можна прыняць да 2 сакавіка. Больш падрабязную інфармацыю вы атрымаеце ў кіёсках спартыўных латарэй.

М. ЯЛАН,
старшы інструктар Беларускага ўпраўлення спартыўных латарэй.

## МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ: ЯК СПРАВЫ?

# Закулiснае знаёмства

Такія ў кожным класе ёсць. Праўда, усё больш дзяўчынкі. А ў мяне — хлопчык. Не мог спакойна сядзець, калі нехта «тануў» ля дошкі. Спяшаўся кінуць выратавальны круг: далонькі рупарам, вусны ў трубачку, вочы насцярожана за настаўнікам сочаць, каб у зручны момант непрыкметна, аднаму яму вядомым спосабам падказаць.

І самой часам не хапала слоў. Тады шукала сярод іншых яго позірк. Дапамагала. Падбадзёрваў, супакойваў. Ён і мне аднойчы падказаў, калі я, каб пазнаёміцца з вучнямі, некалькі дзён прасядзела на «галёрцы». Мяне тады вось што турбавала: чаму трэба навучыцца, пакуль яшчэ наперадзе пяты курс, каб не жахнуліся ў школе пры першай сустрэчы: «Яна ж зусім «зялёная!»? Кім жа трэба быць, каб сапраўдным настаўнікам звацца? Ахвотна падзялюся сваімі назіраннямі.

ПСІХОЛАГАМ. Дарма лічыла, што паспела пазнаёміцца з імі. Гэта ж не азначае ведаць імя кожнага. Размаўляе, не слухае тлумачэнняў Таня. Ужо ў які раз! Першая думка: «І веды ў яе здавальняючыя». Зазірнула пасля ў журнал — пяцёркі. Добра, гэта выпадак выключны. І са стэрэатыпнымі выдатнікамі не ўсё проста. Вельмі балюча ўспрымаюць яны кожную заўвагу. Віка — амаль «адсутнічае» на занятках. Аказваецца, яе займаюць камсамольскія справы.

Раней ўяўляла: я і побач клас. А гэта ж таксама трыццаць — сорак «я». Як разглядзець? Як паводзіць сябе з імі? Адчуваю недахоп ведаў па мудрай псіхалогіі. Смешная. Чаму здзіўляюся? На факультэце яе вывучаем адзін семестр. Неабавязковы прадмет, без якога настаўніку нельга?

НАВАТАРАМ. Гавораць, добра ўжо, калі адзін чалавек зразумеў усё. Мяне гэта задаволіць не можа. Трывалыя веды павінны атрымліваць у час заняткаў усе. Вось я чаму пайшла на хімфак? Таму што хімію не любіла. Палічыла: вывучу — палюблю. Калі мала ведаеш, няма падстаў для ўзаемных сімпатый.

Як зацікавіць? Зразумела, на гітары там іграць не будзеш. І ўсё ж не разумею я заўвагі настаўнікаў у той школе, дзе мы праходзілі практыку: «Не адыходзьце ад методык, выкарыстоўвайце правераныя формы». А калі я лічу, што лепш, каб пытанні вучню задаваў клас? Калі мне імпануе праблемны метад навучання? Наша Іра Жыхар, напрыклад, складала красворды, праводзіла спаборніцтвы...

ПРАМОЎЦАМ. Сапраўды, аб неабходнай прысутнасці гэтых здольнасцей ні ў час уступных экзаменаў, ні потым чамусьці не вядзецца размовы. Затое дзеці прыкмячаюць адразу і складаную пабудову сказаў, і моўныя памылкі. Смяюцца. Можа і не прама ў вочы, але мне непрыемна нават, калі толькі ў душы.

Не валодаем пачуццём часу, пачуццём дошкі. Не ўмеем талкова і канкрэтна выкладаць матэрыял, нават пры глыбокіх ведах, не звяртаем ўвагі на рытм і дыкцыю. Шкада, што аб увядзенні курса прамоўніцкага майстэрства на педагагічных патоках універсітэта пакуль не думаюць.

Што атрымліваем у адказ? Спачуваю тым, хто асуджаны на моўныя мукі, разумею тых, хто звяртаецца да пакарання двойкай, а паважаю трэціх, якія дзейнічаюць па простай формуле: «Усё аддаў, усё паспеў, усё засвоілі».

Р. ЛЕВАНЕЎСКАЯ,
студэнтка V курса
хімічнага факультэта.

НА ЖАЛЬ, не толькі для аўтара гэтага водгуку на матэрыял «Я — настаўніца», змешчаны ў папярэднім нумары газеты, першая практыка пасля чацвёртага курса нагадвае закуліснае знаёмства з педагагічнай дзейнасцю. Магчыма, у якіх-небудзь ацэнках студэнтка і памылілася. Але няма магчымасці іх перагледзець. Да таго ж і часу засталося нямнога: праз паўгода яе будуць лічыць маладым настаўнікам. А ці назавуць спецыялістам?

## ПАРАДЫ ЎРАЧА

# Ведаць, каб не спатыкнуцца



ПРАЙШОЎ той час, калі ў нашай краіне венерычныя захворванні адлюстроўвалі сацыяльныя ўмовы жыцця, але тым не менш урачам-венеролагам яшчэ часта даводзіцца сустракацца з гэтымі захворваннямі. У чым жа справа? Давайце разбяромся разам.

Да нас у дыспансер звярнуліся двое маладых хлопцаў. Сяргей і Ігар — студэнты адной з ВНУ горада. У абодвух пры абследаванні была знойдзена ганарэя. На пытанне «Ад каго заразіліся?» назвалі адну і тую ж дзяўчыну Аксану, паведамілі яе нумар тэлефона. Аксана аказалася вучаніцай дзесятага класа. Палавую блізкасць з гэтымі студэнтамі адмаўляла. Пры абследаванні было ўстаноўлена, што дзяўчына ўжо мела палавую сувязь з мужчынамі. Ёй прапанавалі з'явіцца ў дыспансер на наступны дзень з маці для правядзення вочнай стаўкі. Прыйшоўшы ў дыспансер, маці Аксаны была абурана тым, што яе дачку ганьбяць, і толькі пасля гутаркі з урачом зразумела сур'ёзнасць пытання, а таксама ўсвядоміла свае памылкі ў выхаванні дачкі. Пры правядзенні вочнай стаўкі словы дзяўчыны пацвердзіліся. Сяргей і Ігар папрасілі прабачэння ў яе і ў маці, а таксама паведамілі нумар тэлефона яшчэ адной Аксаны. Яна прыйшла на наступны дзень таксама з маці. І для гэтай маці выклік у дыспансер аказаўся поўнай нечаканасцю. Тут яна даведалася, што яе дачка, вучаніца восьмага класа, уступала ў палавыя кантакты. На вочнай стаўцы ўсё пацвердзілася, а пры абследаванні ў дзяўчыны была выяўлена ганарэя. Можна толькі здагадвацца, якім няшчасцем для маці аказалася наведванне дыспансера.

Добра, калі нашы пацыенты ведаюць хаця б імя, рабочы або дамашні нумар тэлефона сваіх палавых партнёраў. Самыя здавалася б нязначныя даныя дазваляюць знайсці іх. Калі ж зрабіць гэта немагчыма, яны становяцца крыніцай заражэння здаровых людзей. Так здарылася і з Міхаілам К. На пытанне, хто яго заразіў ганарэяй, цвёрда адказаў:

— Ірына, хто ж яшчэ!

— Позвішча? Дзе працуе?

— Прозвішча не ведаю, а працуе ў сталовай. Кім? Не ведаю.

Нават слоўны партрэт быў нейкі расплывчаты: «Вясёлая, прыгожая, з густам адзетая». Вось і шукаем іголку ў стозе сена. А Міхаіл кожны дзень пытае:

— Знайшлі?

— Не.

— Чаму так доўга шукаеце?

Мы прапанавалі яму дапамагчы нам, абысці гарадскія сталовыя, але ён катэгарычна адмовіўся:

— Гэта ваша работа, самі шукайце.

Такіх Міхаілаў, людзей, пазбаўленых пачуцця адказнасці, якія не вызначаюцца высокай мараллю, нямала. «Нас заразілі, ратуйце, дапамажыце, пакарайце вінаватых!» Нібы самі ні пры чым, нібы амаральны лад жыцця — жыццёвая норма. Часта такія хвіліны слабасці разбураюць сямейнае шчасце, прыносяць вялікае няшчасце дзецям. Так, дзецям. Венерычныя захворванні небяспечныя не толькі для хворых і тых, хто іх акружае, але і для патомства.

Нягледзячы на тое, што Сусветная арганізацыя аховы здароўя праводзіць велізарную і рознабаковую работу па барацьбе з венерычнымі захворваннямі, колькасць хворых у свеце працягвае расці. Кожны год каля 50 мільёнаў чалавек хварэюць сіфілісам і каля 200 мільёнаў — ганарэяй.

Урачу-венеролагу ў час работы даводзіцца па расказах хворых знаёміцца з інтымным бокам іх жыцця. Згодна з прафесійным абавязкам урач не мае права расказваць звесткі пра хворага, таму толькі поўная шчырасць апошняга дапамагае абследаваць усіх тых, хто быў з ім у палавой блізкасці. Вядома, што некаторыя венерычныя захворванні небяспечныя нават пры бытавым кантакце.

Мы лечым не толькі медыкаментамі, але і словам: імкнемся дапамагчы маладым людзям зразумець свае памылкі, накіраваць іх жыццё ў нармальнае рэчышча. Даведваемся аб іх поглядах на дружбу, каханне, вернасць, сям'ю, расказваем аб тым, да якіх пагубных вынікаў можа прывесці ўхіленне ад лячэння. І калі гэта дапаможа нашым пацыентам пазбегнуць паўторнага лячэння ў дыспансеры, то лічым, што нашы намаганні не прапалі дарэмна. Але, на жаль, нярэдка нашы словы не даходзяць ні да розуму, ні да сэрца хворага. Некаторыя, прайшоўшы курс лячэння ў скурна-венералагічным дыспансеры, заражаліся зноў і траплялі да нас другі, трэці і нават чацвёрты раз. Тут без каментарыяў зразумела, які іх лад жыцця, інтэлект, маральны ўзровень.

Заканадаўства нашай краіны прадугледжвае крымінальнае пакаранне тых, хто, ведаючы, што ў яго венерычнае захворванне, заразіў другога або ўхіляецца ад лячэння. Адмаўленне назваць урачу ўсіх асоб, якія знаходзіліся ў палавым ці бытавым кантакце з венерычным хворым, разглядаецца як злачынства. Алкаголікі, а таксама тыя, хто вядзе распушчанае палавое жыццё, садзейнічаюць распаўсюджанню венерычных захворванняў. Галоўнай умовай прадухілення іх з'яўляецца высокае маральнае аблічча чалавека, высокамаральныя паводзіны ў быце, на рабоце. Здаровы лад жыцця, чысціня ва ўзаемаадносінах полаў, шлюбная вернасць — вось лепшыя метады прафілактыкі венерычных захворванняў.

Л. КАСПЯРОВІЧ,
загадчык дыспансернага аддзела
Мінскага гарадскога скурна-венералагічнага
дыспансера.

## ЦВЯРОЗАСЦЬ— НОРМА ЖЫЦЦЯ

# Не часовае мера-прыемства

СПАЧАТКУ крыху статыстыкі. У мінулым годзе ў рэспубліцы адбылося 7079 дарожна-транспартных здарэнняў. У іх загінуў 1251 чалавек і 7415 атрымалі раненні.

На жаль, сярод праваарушальнікаў, калі ўважліва прагледзіце спісы, вы сустрэнеце і прозвішчы супрацоўнікаў універсітэта. У мінулым годзе міліцыя зарэгістравала ўзросшую (у параўнанні з 1986-м) колькасць хуліганскіх учынкаў, аматараў «адпачыць» у медвыцвярэзніку. Пабывалі тут і выкладчыкі, і супрацоўнікі, і студэнты.

Агульная колькасць затрыманых у грамадскіх месцах у нецвярозым стане крыху знізілася, але гэта не павінна служыць падставай для самазаспакоенасці. Яшчэ нямала тых, хто, як кажуць, любіць вострыя адчуванні і, прыняўшы хмельнага зелля, садзіцца за руль уласнай (ці службовай) машыны. Звычайна рэзультат такіх паездак адзін: затрыманне міліцыяй.

Дарэчы адзначыць, што нецвярозыя вадзіцелі летась з'явіліся віноўнікамі 1026 дарожна-транспартных здарэнняў. Работнікамі міліцыі былі складзены акты і на дзесяць супрацоўнікаў універсітэта. Сярод іх аказаліся намеснік загадчыка аддзела СКТБ з доследнай вытворчасцю Ю. В. Голубеў, былы вадзіцель Ф. Ф. Шайко і іншыя.

Ці не праўда, сумная статыстыка. А каб гэтага не было, патрэбна вялікая прафілактычная работа. Не хачу сцвярджаць, што ў БДУ яна не праводзіцца. Толькі таго, што робіцца ў даным напрамку, відавочна недастаткова. Кіраўніцтву універсітэта, партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацыям патрэбна памятаць, што барацьба з п'янствам — гэта не часовае мерапрыемства, а паўсядзённая, мэтанакіраваная работа.

А. СЛЕСАРЭНКА,
начальнік аддзялення
ДАІ Маскоўскага
РАУС г. Мінска,
капітан міліцыі.

## ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗНАЁМЫ З НАТХНЕННЕМ

# Складаецца альманах

МАЛАДЫМ паэтам, празаікам, крытыкам, перакладчыкам і публіцыстам, якія зараз вучацца ва універсітэце альбо закончылі вучобу, прапануем стаць яго аўтарамі. Усе рэдактарскія функцыі бяруць на сябе самі студэнты.

Просьба свае творы і цікавыя прапановы наконт выпуску і афармлення альманаха прыносіць на кафедру беларускай літаратуры філалагічнага факультэта (вул. Чырвонаармейская, 6) ці ў пакой № 616 (б) інтэрната № 7 (вул. Кастрычніцкая, 10а) з такім разлікам, каб у КАНЦЫ САКАВІКА рукапіс альманаха можна было аднесці ў выдавецтва.

На асобнай старонцы напішыце некалькі слоў пра сябе: год і месца нараджэння, на якім курсе і на якім факультэце займаецеся. Калі да паступлення ў БДУ працавалі, то ўкажыце, дзе.

І яшчэ адна даведка: альманах будзе беларускамоўным.

А. БАДАК,
адзін са складальнікаў
альманаха.






## СУСТРЭНЕМСЯ Ў ЭФІРЫ

# Не забудзьце ўключыць тэлевізар

У Беларускага тэлебачання — новы адрас. З няўтульных памяшканняў супрацоўнікі рэдакцый пераехалі ў нядаўна пабудаваны семнаццаціпавярховы комплекс. На вуліцы Макаёнка, у доме № 9, на дванаццатым паверсе размясцілася галоўная рэдакцыя музычных праграм БТ.

Што ж, гэта добры знак.

«Сустрэнемся пасля адзінаццаці». Без гэтай праграмы ўжо цяжка ўявіць сабе Беларускае тэлебачанне. А ў апошні час передача прадстае перад гледачамі ў інфармацыйна-музычным варыянце. Ледзь не напісала — жанры. Бо інфармацыйна-музычны прынцып пабудовы перадач — хутчэй не жанр, а форма. У перспектыве эфірны час ТБ будзе прадстаўляць сабой адзіны інфармацыйна-музычны блок.

Але пакуль інфармацыйна-музычныя праграмы будуць заключаны ў рамкі вызначанага часу, гэта не выключае прысутнасці і нейкіх жанравых асаблівасцей. Гэта адлюстроўваецца ў спробе стварыць адзіную драматургічную лінію. Апошняя перадача, напрыклад,— апавяданне пра сям'ю, пра яе нараджэнне, пра адносіны паміж супругамі. Вершы Ніла Гілевіча падтрымліваюць лірычны тон апавядання як роздум аб нялёгкіх праблемах адносін паміж людзьмі.

Работа над перадачай працягваецца і зараз. Ідуць спрэчкі аб яе змесце і форме. Магчымасць стварэння «Сустрэнемся...» будзе дана ўсім рэжысёрам галоўнай рэдакцыі музычных праграм. Спадзяюся, гэта дапаможа зрабіць наша баўленне часу перад экранам больш разнастайным і цікавым.

«Метраном», «Нашы госці», «Прыкметы сезона», «Песню бярыце з сабой», «Саюз мастацтва і працы» — гэта далёка не поўны спіс праграм, над якімі працуе музычная рэдакцыя Беларускага тэлебачання.

Ж. ПАЛЯКОВА.

## ЗАХАВАЦЬ СПАДЧЫНУ

# ЯК СВЯТКАВАЦЬ КАЛЯДЫ?

СПАЧАТКУ думала пакрыўдзіцца: мой субяседнік нібы знарок хацеў паставіць мяне ў няёмкае становішча.

— Як у вашай вёсцы святкуюць Каляды?

— А што гэта за «Жаніцьба Цярэшкі»?

— Што вы ведаеце пра жанры фальклору?

Як на сапраўдным экзамене. На жаль, на многія пытанні я так і не змагла адказаць. І толькі пасля гэтага вымушана была пагадзіцца з думкай: «Кепска, што на факультэце журналістыкі не вывучаюць фальклор. Дрэнны той журналіст, які не ведае традыцый, спадчыны свайго народа». Пераканалася: справа, якой займаюцца супрацоўнікі (іх дзевяць) навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі,— вельмі неабходная для ўсіх нас. Кіруе калектывам аднадумцаў (не пабаюся гэтага слова) кандыдат філалагічных навук Васіль Дзмітрыевіч Ліцвінка. Чалавек, бясспрэчна, таленавіты, захоплены.

Напэўна, са мной згодзіцца кожны: забываем мы народныя традыцыі. І калі дзе-нідзе ў вёсках (у асноўным на Палессі) яны яшчэ жывуць, то ў горадзе... Хіба толькі провады зімы. Але і гэта свята праводзіцца «на сучасны манер», добра, што з народнымі казачнымі персанажамі.

Успамінаецца дзяцінства. А разам з ім — цудоўнае свята Каляды. Іх заўсёды стараліся правесці весела, цікава, бо кожны быў упэўнены, што год будзе такім, як яго сустрэнеш, што ўсе пажаданні, аб якіх праспяваюць табе калядніці, абавязкова збудуцца.

Само калядаванне — гэта абход вёскі з песнямі. Дарэчы, песня, бадай, самы распаўсюджаны жанр фальклору. Тут і калядныя песні, і вясельныя, веснавыя, купальскія, рэкруцкія, сацыяльна-бытавыя, любоўныя, жартоўныя, сучасныя і г. д. І ў кожнай з іх — шчырасць, непаўторнасць, самабытнасць.

— Сярод песеннай творчасці беларускага народа,— расказвае, нібы імкнучыся пераканаць у гэтым мяне, Васіль Дзмітрыевіч,— ёсць цудоўныя па зместу і мелодыцы творы, якія займаюць пачэснае месца між лепшых узораў фальклорнай паэзіі народаў свету, вылучаюцца сваім мастацкім узроўнем, глыбокай філасофіяй. У гэтых песнях — вялікі эмацыянальны зарад, урачыстая паэтыка і ўзнёсласць. Многія народныя творы ўздымаюцца да вяршынь філасофскай лірыкі, якая ахоплівае маштабныя праблемы жыцця і смерці, любві да роднага краю, да зямлі.

Трэба адзначыць, што шматлікія шэдэўры беларускай нацыянальнай культуры адроджаны і захаваліся дзякуючы супрацоўнікам лабараторыі. Пастаянныя камандзіроўкі, сустрэчы з людзьмі, запісы, апрацоўкі, а потым — публікацыя некаторых твораў: у часопісах, газетах, спецыяльных выданнях. У збіральнікаў фальклору, заўважу, многа памочнікаў. Прычым памочнікаў у самым лепшым сэнсе гэтага слова: ініцыятыўных, дзейсных, сапраўдных знатакоў народнай творчасці. Прынамсі, важная частка работы супрацоўнікаў НДЛ — арганізацыя фальклорнай практыкі. Кожны год пасля праслухоўвання тэарэтычнага курса на фальклорную практыку выязджаюць першакурснікі. Плён іх праца прыносіць вялікі: кожны студэнт запісвае каля пяцідзесяці песень.

Супрацоўнікі лабараторыі працуюць па дзвюх навуковых тэмах: фальклорная спадчына і яе значэнне для сучаснасці (кіраўнік В. Д. Ліцвінка) і этналінгвістычныя даследаванні беларускага Палесся (кіраўнік М. П. Антропаў).

— Мы распачалі выданне серыі «Беларускі фальклор у сучасных запісах»,— працягвае нашу размову В. Д. Ліцвінка.— Ужо выйшла першая частка, прысвечаная лёсу традыцыйнага фальклору Брэсцкай вобласці, якая складае значную частку беларускага Палесся. Мяркуем у гэтым годзе выдаць жанры Гомельшчыны і ўжо працуем над зборнікам традыцыйных жанраў фальклору Міншчыны. За ўсім гэтым — карпатлівая збіральніцкая праца, апрацоўка матэрыялу. Музыказнаўца падбірае музычнае афармленне. Згадзіцеся, музыка істотна ўзбагачае змест песні, павышае ўздзеянне паэтычнага слова на слухача.

— Шчодрая на таленты беларуская зямля, — уступае ў размову М. П. Антропаў,— невычэрпныя крыніцы народнага мастацтва, толькі вывучаецца беларускі фальклор недастаткова (дарэчы, у XIX стагоддзі гэта рабілася значна лепш). Мэта наша — вярнуцца да сапраўднага, навуковага, рэгіянальнага вывучэння нашай фальклорнай спадчыны.

Патрэбна адзначыць, што яны робяць усё магчымае, каб зберагчы гэту спадчыну. У практыцы здаралася такое, што фальклор «губляўся» там, дзе яго запісвалі. Доўга меркавалі, як пазбегнуць такога негатыўнага моманту, як увекавечыць народную творчасць. І вырашылі рыхтаваць фальклорна-рэпертуарныя зборнікі па раёнах. Тут ёсць яшчэ адна выгада: яны з'явяцца добрай падмогай для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Нельга ў невялікім матэрыяле расказаць пра тую шматгранную работу, якой займаюцца супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі.

На развітанне я запытала ў В. Д. Ліцвінкі: «Што прыносіць Вам найбольшае задавальненне?». Ён зірнуў на мяне крыху здзіўлена:

— Ведаеце, ёсць творы-матылі, якія кранаюць часова, а народная творчасць — на стагоддзі. У ёй цэлая гама пачуццяў, цэлы свет, непаўторная вобразнасць. Дадам вось што. Хачу, каб у чытача не склалася няправільнае ўяўленне аб нашай рабоце. Мы збіраем не толькі песні, хаця яны займаюць асноўнае месца. У памяці людзей жывуць шматлікія казкі, легенды, прыказкі, прымаўкі, загадкі. Усё гэта таксама цікавіць нас.

...Невялікі пакой, які абавязкова патрэбна прайсці, каб трапіць у лабараторыю, застаўлены шафамі.

— Што ў іх? — пацікавілася я.

— Тут — народная творчасць.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі фальклорных калектываў вёскі Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, філалагічнага факультэта і сярэдняй школы № 150 г. Мінска.

## ТРЫМАЮЧЫ ДЫСК

ЦЕПЛЫ майскі вечар. Мы не можам адвесці вачэй ад роўнага ярка-жоўтага полымя кастра. За спіной — прыціхлая цемра хвоі. Пастаянны спадарожнік нашай кампаніі — касетны магнітафон — дорыць лёгкую, запамінаючуюся мелодыю:

*Годы летят стрелою,*
*Скоро и мы с тобою*
*Разом из города уйдем.*

Нам, шаснаццацігадовым хлапчанятам і дзеўчанятам, якія стаяць на парозе экзаменаў, гэтыя простыя словы здаюцца самай высокай паэзіяй. Сэрца салодка замірае ад прадчування перамен, безумоўна, шчаслівых. Жыццё будзе цудоўным і «усіх нас сагрэе вера адзіная». Усіх: будучых матэматыкаў, паэтаў, медыкаў і іх куміраў, таленавітых, як Андрэй Макарэвіч.

У кожнага сустрэчы з «Машиной времени» адбываліся па-свойму. А ў мяне адна з самых хвалюючых сустрэч з песнямі групы адбылася цяпер.

Я трымаю ў руках апошні дыск з іх... першымі песнямі. Завецца ён «Праз дзесяць гадоў».

Склалася парадаксальная сітуацыя. «Машина времени» найграла альбом новых песень, а на фірму «Мелодыя» зноў і зноў ішлі лісты з просьбамі выпусціць дыск «старых» песень групы. І вось, урэшце, дзесяць гадоў апасля «стары карабель» «Машины времени» адправіўся ў вялікае плаванне.

«Песня жыве нядоўга, адыходзіць, саступаючы месца новым, застаючыся толькі ў нашай памяці. І калі гэта пласцінка нагадае каму-небудзь гады яго юнацтва — мы будзем лічыць сваю задачу выкананай»,— піша ў анатацыі да дыска Андрэй Макарэвіч. Гэту задачу пласцінка не магла не выканаць. Напэўна, любы заўважаў, што лепш за ўсё напамінаюць мінулы час мелодыі гэтага часу. Як вільгатнеюць вочы нашых бацькоў пры першых гуках шлягера 50-х гадоў:

*Ландыши, ландыши —*
*Майского солнца привет.*

Такім жа светлым сумам напаўняецца душа іх дзяцей пры словах:

*Все очень просто.*
*Сказки — обман.*
*Солнечный остров*
*Скрылся в туман.*
*Замков воздушных*
*не носит земля.*
*Кто-то ошибся. Ты или я.*
(«Ты ці я»).

Гэты дыск мог бы стаць музычным сувенірам 70-х.

## «МАШИНА ВРЕМЕНИ»:




Фота Д. ВІЛЬКІНА.

Але светла і сучасна гучаць сёння «Марыянеткі», ніколькі не ўступаючы «Флюгеру» ужо сталай «Машины времени».

*И кукол снимут с нитки*
*длинной*
*И, засыпав нафталином,*
*В виде тряпок сложат*
*в сундуках.*

Жорсткі прыгавор «Машины» канца 70-х прыстасаванцам і паслухмяным выканаўцам. Ці хвалююча знаёмае:

*Мы себе давали слово*
*Не сходить с пути прямого.*
*Но так уж суждено!*

Калі ў канцы 70-х гадоў пачалі гаварыць пра заняпад «песні для народа», калі немагчыма было спяваць разам пад гітару пра тое, «до чего ж я невезучий» ці пра тое «как мне горько, что это горько кричат не мне», на прывакзальных плошчах, у электрычках, ля турысцкіх кастроў маладыя рабяты і дзяўчаты заклікалі да павароту жыцця:

*Выезжайте за ворота*
*И не бойтесь поворота.*
*Пусть светлым будет путь!*
(«Паварот»).

Мы былі гатовы рызыкаваць, нешта рабіць, мяняць вось так, разам, «хорам» павярнуць усё, верылі ў тое, што за паваротам узлёт, а не вір...

І вось толькі сёння мы рашыліся гэты паварот зрабіць. Але і тут Андрэй Макарэвіч аказаўся празарліўцам:

*И уж, если откровенно,*
*Всех пугают перемены.*

*І вялікая частка тых «крутых» рабят з 70-х трапіла ў лік «усіх». Можа, таму нам сумна?*

*«Забірайце з сабой пачуцці маладосці, апасля не падымеце»,— заўважыў аднойчы Гогаль.*

*Как трудно стерпеть*
*И сберечь все цветы,*
*И сквозь холод и мрак*
*Поднимать на мачте мечты*
*Свой единственный флаг.*
*(«Флаг над замкам»).*

Гэты дыск рок-групы «Машины времени» мог бы стаць проста сувенірам, калі б не гучала ў ім вера ў магчымасць вяртання да гэтых «пачуццяў маладосці».

Ж. МІХАЙЛАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
25 лютага
Зак. 1612.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.